эср 3180

Бібліятэка АН БССР

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

# Чырвоная Зара

Орган Чырвона-Слабодскага РК КП(б)Б

№ 33 (1765) | Субота, 10 чэрвеня | 1944 г.

**Прачытаў—перадай другому!**

Няхай жыве перамога Англа-Савецка-Амерыканскага баявога саюза над злейшымі ворагамі чалавецтва—нямецка-фашысцкімі захопнікамі!

## Высадка саюзных армій на ўзбярэжжы Паўночнай Францыі

Аб'яднаныя нацыі адзержалі яшчэ адну бліскучую перамогу над гітлераўскай Германіяй — англа-амерыканскія войскі пад камандаваннем генерала Эйзенхаўэра высадзіліся на ўзбярэжжы Паўночнай Францыі.

Высадка саюзных армій у Паўночнай Францыі распачалася ў ноч з 5-га на 6-е чэрвеня. Ваенныя дзеянні разгарнуліся на поўначы Францыі паміж портам Шэрбургам і вусцем р. Сены. Аб маштабах аперацыі можна судзіць па тым, што ў ёй удзельнічала 4000 караблёў і некалькі тысяч дэсантных баржаў і дробных суднаў. Для прыкрыцця высадзіўшыхся войск саюзнае камандаванне сканцэнтравала 11000 самалётаў першай лініі, якія могуць уводзіцца ў бой па меры неабходнасці. Да поўдня 8-га чэрвеня авіяцыя саюзнікаў зрабіла 27000 самалёта-вылетаў. За варожымі лініямі абароны ажыццяўлена масавая высадка паветраных дэсантаў.

Нямецка-фашысцкае камандаванне стараецца ўсімі мерамі памяшаць высадцы англа-амерыканскіх войск, але беспаспяхова. Не гледзячы на тое, што немцы ўжо ўвялі ў бой 10 сваіх дывізій, але істотна затрымаць разгортванне ваенных аперацый саюзнікаў яны не змаглі.

Цяпер у радзе пунктаў ідуць жорсткія баі. Бой у раёне Кан-Байе завяршыўся заняццем саюзнікамі гор. Байе. Дарога паміж гарадамі Кан і Байе перарэзана саюзнымі войскамі ў некалькіх месцах.

Англійскія танкавыя часці прарвалі нямецкую лінію абароны ў раёне Байе і прасоўваюцца ў паўднёва-заходнім напрамку. Саюзныя войскі, не гледзячы на ўпартае супраціўленне ворага, паступова пашыраюць захопленыя плацдармы і прасоўваюцца ўперад на ўсіх участках фронта. Бесперапынна праводзіцца высадка ўсё новых і новых дэсантаў саюзнікаў.

„Мы надзеемся прыпадаесці ворагу паслядоўны шэраг сюрпрызаў у ходзе баёў. Маштабы бітвы і яе інтэнсіўнасць будуць пастаянна ўзрастаць на працягу прадстаячых некалькіх тыдняў,“—заявіў прэм'ер-міністр Англіі Чэрчыль у сваім выступленні ў Палаце Абшчын.

Такім чынам, падзеі апошніх дзён паказалі ўсю негрунтоўнасць гітлераўскай прапаганды аб непрыступнасці іх абаронных пазіцый на ўзбярэжжы Атлантычнага акіяна. Другі фронт у Еўропе стаў фактам. „Высадка прадстаўляе сабой,—заявіў генерал Эйзенхаўэр,—частку ўзгодненага плана вызвалення Еўропы сумесна з нашымі рускімі саюзнікамі.“

Пераўтвараюцца ў жыццё рашэнні Тэгеранскай канферэнцыі кіраўнікоў трох дзяржаў аб тым, што „Ніякая сіла ў свеце не зможа памяшаць нам знішчаць германскія арміі на сушы, іх падводныя лодкі на моры і разбураць іх ваенныя заводы з паветра. Наша наступленне будзе бязлітасным і нарастаючым“.

## Весткі з фронта

### (З 6-га па 10-е чэрвеня)

У раёне паўночна-заходней і паўночней гор. Ясы (Румынія) нашы войскі паспяхова адбілі ўсе атакі пяхоты і танкаў праціўніка. Па ўдакладненым дадзеным у выніку баёў з 30-га мая па 6-е чэрвеня нашы войскі нанеслі праціўніку наступныя страты ў жывой сіле і тэхніцы: падбіта і знішчана 315 нямецкіх танкаў і самаходных гармат, знішчана 29 бронемашын і бронетранспарцёраў, 62 гарматы рознага калібра, 240 кулямётаў і да 400 аўтамашын. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіт 151 самалёт праціўніка. Праціўнік страціў толькі забітымі звыш 10 000 сваіх салдат і афіцэраў.

На іншых участках фронта—без змен.

За час з 5-га па 9-е чэрвеня нашы войскі на ўсіх франтах падбілі і знішчылі 40 нямецкіх танкаў, збілі 151 самалёт праціўніка.

---

### Бамбардыроўка нашай авіяцыяй чыгуначнага вузла і ваенных аб'ектаў гор. Ясы

У ноч на 6-е і 7-е мая наша авіяцыя далёкага дзеяння ўтварыла масіраваныя налёты на чыгуначны вузел і ваенныя аб'екты гор. Ясы (Румынія). У выніку бамбардыроўкі ўзніклі шматлікія пажары, якія суправаджаліся моцнымі ўзрывамі. Гарэлі чыгунач. эшалоны, станцыйныя будынкі і ваенныя склады праціўніка.

жр 3180



## Эшалон ворага з тэхнікай не дайшоў да фронта

Камандзір атрада імя Варашылава ў бягучым месяцы даў заданне групе партызан падарваць варожы эшалон. Адказным за выкананне задання быў пастаўлен памочнік камандзіра ўзвода Грыгорый К. Атрыманае заданне Грыгорый К. выканаў. Узяўшы з сабою байцоў-партызан Яраслава Г., Нікалая П. і Паўла Я. і, растлумачыўшы задачу, Грыгорый рушыў да чыгункі Л.—Б.

Адважная чацвёрка, не гледзячы на ўсе перашкоды, удала замініравала чыгуначны шлях і з нецярплівасцю чакала выпікаў. Хутка са свістам мчаўся варожы эшалон да лініі фронта. Выбух. З лязгам і скрыгітаннем вагонаў састаў пад адкос. Пры гэтым разбіўся 1 паравоз і 8 платформаў, на каторых змяшчаліся 7 аўтамашын і 3 гарматы. 1 аўтамашыны і гарматы выведзены са строю. Ад узрыва загінула 3 і атрымалі раненні 3 фрыцы.

Партызаны страт не мелі.

**Партызан Іван Д.**

## ПАДАРВАЛІ 2 ЛЕГКАВЫЯ І 1 ГРУЗАВУЮ АЎТАМАШЫНУ

Падрыўнікі атрада, дзе камандзірам Сяргей М. (партызанская брыгада імя Сталіна), не даюць ворагу спакою ні днём ні ноччу. Днямі група падрыўнікоў атрада пад старшынствам Уладзіміра С. умела замініравала шашу Масква—Варшава.

На пастаўленых партызанамі мінах падарваліся 2 легкавыя і 1 грузавая аўтамашына праціўніка. Пры ўзрывах мін забіт шофер і 3 немцы.

**Партызан Ігар Р.**

## Збылося прароцтва правадыра

Партызанскі агітатар з'яўляецца чаканым і паважаным госцем у кожнай вёсцы. Ад яго звычайна атрымаеш зразумелы адказ на хвалюючыя пытанні, пачуеш словы бальшавіцкай праўды.

Вось і сёння па ўсёй вёсцы відаць групы сялян. У цэнтры кожнай групы сялян агітатары з партызанскага атрада імя Варашылава. Агітатары зачытваюць толькі што атрыманае паведамленне аб высадцы англа-амерыканскіх войск у Заходняй Еўропе. З вялікай радасцю сустрэлі сяляне вёскі С. паведамленне штаба Вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў аб высадцы саюзных армій на ўзбярэжжы Паўночнай Францыі.

Збыліся мудрыя словы любімага правадыра таварыша Сталіна, які 6-га лістапада 1943 года ў сваім дакладзе на ўрачыстым пасяджэнні Маскоўскага Совета Дэпутатаў Працоўных сказаў: „Зразумела, што адкрыццё сапраўднага другога фронта ў Еўропе, якое не за гарамі, значна паскорыць перамогу над гітлераўскай Германіяй...“

Усё гэта натхняе нас на самаадданую барацьбу з заклятым фашызмам.

**ВОЛЬКА М., НІКАЛАЙ С., ЛЯВОН Р., ГАННА У., НАДЗЯ Р., сяляне вёскі С. Чырвона-Слабодскага р-на.**

## *Ваенныя дзеянні ў Італіі*

**(З паведамлення ТАСС)**

ЛОНДАН, 9-е чэрвеня. Пад магутнымі ўдарамі войск саюзнікаў немцы адступаюць па ўсёй лініі фронта. Праціўнік прыкрывае сваё адступленне ар'ергарднымі баямі і робіць вялікія разбурэнні. Часцямі саюзнікаў узяты гарады Толло (заходней Ортоно), Агоста (паўднёва-заходней Авеццано), Паломбара-—Сабіна (паўночна-усходней Рыма), Сутры (паўночна-заходней Рыма) і Капрарола (паўднёва-заходней Віцербо). Войскі 5-й арміі авалодалі гор. Чывіта-Кастэллана, які размешчан у 50 кіламетрах паўночней ад Рыма.

У госпіталях Рыма выяўлена 8000 раненых немцаў.

Авіяцыя саюзнікаў падвергла бамбардзіроўцы войскі праціўніка і яго ваенныя аб'екты. Шэраг злучэнняў утварылі мінулай ноччу налёт на гор. Ніш і іншыя варожыя аб'екты Югаславіі.

ВАШЫНГТОН, 8-е чэрвеня. Па заяўленні ваеннага міністра ЗША Сцімсона на працягу некалькіх дзён у р-не баёў у Італіі не было відаць германскіх самалётаў. Армія Кесельрынга разрэзана на часткі. Войскі саюзнікаў хутка прасоўваюцца на поўнач.

## ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

У сакавіку месяцы ў налётах на Германію і акупіраваныя ёю тэрыторыі ўдзельнічала 8000 англійскіх бамбардзіроўшчыкаў. За месяц яны скінулі 31500 тон бомбаў, у тым ліку 22500 тон на Германію.

Па чыгунцы, па дарозе
Едзе фрыц на паравозе.
Ён вядзе на фронт састаў,
А ты шашку ім пастаў.
І паглядзім, як ад толу
Задзяруцца ўгору колы.

Выданне Чырвона—Слабодскага РК КП(б)Б. РЭДКАЛЕГІЯ.